**Т.І. Купрэева**

# СЕМАНТЫЧНЫЯ І СТЫЛІСТЫЧНЫЯ ФУНКЦЫІ СКЛАДАНАСАСТАЎНЫХ ПРЫНАЗОЎНІКАВЫХ ЗВАРОТАЎ У МАСТАЦКІМ ТЭКСЦЕ

Для больш поўнай характарыстыкі такой з'явы, як утварэнне і ўжыванне новых прыназоўнікаў, т. зв. складанасастаўных прыназоўнікавых зваротаў [1, с. 8], іх ролі ў мастацкім творы былі прааналізаваны адпаведныя тэксты. Крыніцамі збору матэрыялу паслужылі аповесці і апавяданні В. Быкава, К. Чорнага, І. Чыгрынава, І. Навуменкі.

У прозе К.Чорнага найбольш пашыранымі з'яўляюцца прыназоўнікі, што выражаюць прасторавыя адносіны. Яны прадстаўлены адзінкамі з параметрычнымі назоўнікамі *месца, перад, сярэдзіна, канец, бок, край, глыбіня, бераг, бляск*. Прыназоўнікі, утвораныя пры дапамозе прадстаўленых назоўнікаў, указваюць на: лакалізаванасць аб'екта, прадмета ў прасторы (*Дзядзька Язэп стаў у варотах і глядзіць на пажоўклую траву* ***перад*** *гумном... Гэта тады брат цыганскае дзяўчыны стаяў* ***на беразе*** *рэчкі. Быў ён* [жах] ***у бляску*** *сонца і ў трывожным шуме жыта*); становішча аб'ектаў ў адносінах адзін да аднаго (*Тады ён, невядома дзеля чаго, сказаў* ***ў бок*** *Мікіткі – Хоць бы агонь ў лямпе прыкруціць трохі.*); здольнасць аб'ектаў мець параметры: аб'ём, глыбіню, шырыню, даўжыню (*Амелька адплыў* ***на сярэдзіну*** *ракі, прыпыніўся і стаў глядзець на ваду. І тады прыпомнілася самае важнае, што ўсё рупіла неяк несвядома, знаходзілася недзе* ***ў глыбіні*** *істоты...*).

Другую па-колькасці групу складаюць ССПЗ, што абазначаюць тэмпаральныя адносіны: *у час, у хвіліны, да пачатак*, у *канцы, у працэсе, у такт*.

Назоўнік *час* з'яўляецца найбольш агульным у абазначэнні тэмпаральных адносінаў. Канструкцыя *ў час* абазначае перыяд, адрэзак, адзначаныя нейкім здарэннем або звязаныя з жыццём ці дзейнасцю каго-небудзь (*Шкода вельмі стала нечага, і адчуў Андрэй вялікі смутак па тым харастве, якое бачыў тады вечарам* ***у час*** *скокаў цыганкі...*).

Для ўказання на пэўны адрэзак часу, на працяглае, незакончанае дзеянне ўжываюцца канструкцыі *ў хвіліны, у працэсе* (*Цяпер часам,* ***у хвіліны*** *бур і вострых пакут духу, я думаю так... Можа гэтая агульнасць з'явілася* ***ў працэсе*** *жыцця.*).

"Фазавыя" назоўнікі *пачатак, канец* з'яўляюцца "стрыжневымі" кампанентамі канструкцый, дзе дзеянне лакалізуецца ў часе і характарызуе

яго структуру (*Можа быць, – сказаў ён з пачуццём блізкім* ***да пачатку*** *злосці.*).

Сярод складанасастаўных прыназоўнікавых зваротаў (ССПЗ) вылучаецца ССПЗ *у канцы*. Прыназоўнік з’яўляецца агульным сегментам у абазначэнні розных відаў адносінаў, у прыватнасці прасторавых і тэмпаральных. У адным выпадку ССПЗ *у канцы* ўжываецца для абазначэння месца аб’екта (*Ясна свяціўся* ***ў канцы*** *вуліцы клуб*), а ў другім абазначае час дзеяння (*Будка парома была змайстравана яшчэ* ***ў канцы*** *лета з бярозавых дубцоў*).

ССПЗ *у такт* абазначае рытм руху, дадатковага дзеяння, якое адбываецца сінхронна з асноўным дзеяннем (*І яшчэ павялічвалі гэтыя адчуванні дзяўчыны словы, якія яна неяк гаварыла часта* ***ў такт*** *свайго танца…*).

Значна меншая па-колькасці група ССПЗ, што ўжываюцца для абазначэння сацыяльнага статусу, становішча асобы і сувязей у грамадстве. Група прадстаўлена прыназоўнікамі *пад кіраўніцтвам*, *у ролі*, *пад сцягам*, *у адказ на* (*А ззаду за імі беглі яшчэ «штацкія» хлапчукі* ***пад кіраўніцтвам*** *Юзіка Юзікава... Каля стала стаяў настаўнік* ***у ролі*** *рэжысёра, махаў рукой і нешта расказваў. Усе тыя, што самі працуюць, – гаварыў прамоўца, злучыўшыся,* ***пад сцягам*** *камунізма, арганізуюць вялікую сілу...*).

Грунтуючыся на лексічным значэнні імя *выгляд*, якое замацавалася ў свядомасці носьбітаў як “знешнасць, вонкавае аблічча, стан” [4, с. 122], утварыўся прыназоўнік *у выглядзе* (*Ведама, цяжка, – адказаў жабрак* ***з выглядам*** *чалавека, які мала цікавіцца – лёгка яму ці цяжка.*). Прыназоўнікавая канструкцыя з’яўляецца інструментам параўнання.

Такім чынам, проза К. Чорнага характарызуецца наяўнасцю груп ССПЗ, што абазначаюць прасторавыя, часавыя адносіны, а таксама сацыяльны статус і становішча асобы ў грамадстве.

У творах В. Быкава новыя прыназоўнікі прадстаўлены адзінкавымі прыкладамі: *на працягу*, *у часе*, *за час*, *з прычыны*, *у адносінах да*, *у дачыненні да*, *на чале з*, *у якасці*. Яны ўтвараюць групы ССПЗ, што выражаюць прасторавыя, часавыя, прычынныя адносіны, указваюць на сацыяльны статус асобы (***За час*** *вайны ён і не падумаў пра магчымасць іншае смерці, чым ад асколка ці кулі... Апынуўшыся ў палоне, былы камбат вызваляў яго ад усіх абавязкаў* ***у адносінах да*** *сябе. Баба Хвядора вельмі сачыла і за імі – малымі, і пасля, як падраслі, – каб не было якой*

*несправядлівасці* ***ў дачыненні да*** *іншых, малодшых....* ***У якасці*** *заложнікаў яны не дадуць яму ашукаць немцаў.*).

Творы І. Чыгрынава найбольш насычаны ССПЗ, што абазначаюць прасторавыя адносіны. Акрамя звыклых канструкцый *у сярэдзіне, на сярэдзіне, у бок, у глыб, у глыбіні, на паверхні, на беразе, на краі, за край, на ўскрайне, на ўскрайку, на дне, на скрыжаванні*, якія ўказваюць на локус або параметры аб’екта ў прасторы, сустракаюцца прыназоўнікі тыпу *ў галаве, на выхадзе з, на захад ад, на фоне*, што прыблізна або дакладна называюць месца або ўказваюць геаграфічныя каардынаты (*На скрыжаванне вуліц выплыў* ***у галаве*** *пярэстай калоны піянерскі сцяг з сілуэтам Леніна на чырвоным палотнішчы. Фронт тады стаяў кіламетраў за сто* ***на захад ад*** *вёскі – на беларускай Проні. Ужо* ***на выхадзе з*** *вёскі, якраз на тым месцы, дзе раней стаяў замшэлы крыж, яе раптам аклікнулі. Над зямлёю,* ***на фоне*** *чорнага неба, лунаў Андрэй заграбаючы рукамі густое паветра*).

У канструкцыях *на сконе* (*У Бары Андрэй вяртаўся* ***на сконе*** *дня*), *да ўсходу* (*На гэтай станцыі пасажырскі поезд Ленінград – Марыупаль спыняўся двойчы: з Ленінграда ўранні заўсёды* ***да ўсходу*** *сонца, з Марыупаля ўвечары*), *перад заходам* (*Мне гаварыў пра гэта Мікола, калі* ***перад заходам*** *сонца праводзіў сюды, на грыву, якую цыганы выбралі пад свой табар*) выявілася больш цесная сувязь паміж прыназоўнікам і залежным кампанентам, бо *ўсход* і *захад* – гэта характарыстыка толькі *сонца*, а лексема *скон* (*сканчэнне*) з’яўляецца параметрам назоўнікаў *дзень, жыццё* [4, с. 604].

Трэцяй па велічыні групай з’яўляецца група ССПЗ са значэннем сацыяльнага статусу і стасункаў у грамадстве. У яе ўваходзяць такія прыназоўнікі, як *на чале з, па загаду, за званне, пад прыкрыццём* (*Багацеі стварылі* ***на чале з*** *местачковымі эсэрамі.* ***Па загаду*** *Леніна нам выдалі кажухі, валёнкі, шапкі-вушанкі. Брыгада змагаецца* ***за званне*** *брыгады камуністычнай працы. Нарэшце недзе за Белай Дубровай камандаванне,* ***пад прыкрыццём*** *“кацюш” пераправіла цераз Беседзь танкавую брыгаду...*).

Вылучаюцца адзінкавыя прыклады ССПЗ *пры дапамозе* са значэннем ‘садзейнічанне каму-н. у чым-н.’ [4, с. 767], *у дадатак да*, са значэннем ‘тое, што прыбаўляецца да чаго-н.’ [4, с. 165]: *Пацягнеш за шнурок – і* ***пры дапамозе*** *спецыяльнай спружыны запалка сама чыркае аб карабок і падпальвае спірт. Гэтая віртуозная прадуманасць кожнай дэталі,* ***у дадатак да*** *заведама наіўнага – з нашага цяперашняга пункту погляду, –*

*тэхнічнага матэрыялу і прымушае пакланяцца забытаму генію інжынера Андрэ.*

Найбольшая колькасць ССПЗ сустракаецца ў аповесцях і апавяданнях І. Навуменкі. Дамінуючую групу складаюць ССПЗ са значэннем прасторавых адносінаў. Да названых прыназоўнікаў належаць такія канструкцыі, як *на прасторах, у межах, за межамі, у галаве, на край, на ўскрайку, з вышыні, у напрамку да, у напрамку, у цэнтры, у глыбіні, у канцы, на ўзбочыне, у засені, з дна, на рог, ля падножжа, на развілку, на ўзмежку з, на вечку* (*Калі выйшлі* ***на рог*** *вуліцы, звярнуўшы да новага, з добрых сасновых бярвенняў дома ляснічага, трапіўся насустрач Пухцін... Пакуль яна, па-жураўлінаму падцяўшы нагу, стаяла ў будачцы, ён адышоўся, купіў у зялёным ларку* ***на развілку*** *вуліцы пачак папярос і бутэльку гарэлкі... Трэба было напісаць нейкія словы* ***на вечку*** *табакеркі, каб Косця не забываў свайго класа і свайго гарадка. Ён заўсёды дрэмле ў кустах,* ***на ўзмежку з*** *полем, і ўцякае заўсёды ў поле.*).

Сярод прыназоўнікаў вылучаюцца і ССПЗ, што, абазначаючы прасторавыя адносіны, ужываюцца са значэннем тэмпаральных адносінаў (*У тую самую хвіліну, калі я, здавалася, быў* ***на парозе да*** *вернай перамогі, паяўлялася кватарантка і падымала Пеку ад шахматнай дошкі. Паветра напоена той празрыстасцю і чысцінёй, якая толькі і бывае* ***на схіле*** *гарачага лета. Такая яна вельмі падобная на тую далёкую студэнтачку, якая спаткалася* ***на сцяжынцы*** *юнацтва.*).

ССПЗ са значэннем часавых адносінаў характарызуюцца семантычнай разнастайнасцю. Сустракаюцца “фазавыя” назоўнікі *пачатак, сярэдзіна, канец*, лексемы, што абазначаюць пэўны перыяд, адрэзак часу *хвіліны, перыяд* (*Рэзкі і фанатычны Раман-малодшы* ***ў хвіліны*** *раздражнення крычаў, што ў жылах яго суседа па ложку цячэ не кроў, а слізкая флегма.* ***У перыяд*** *адказных работ праводзім разлік штомесяц.*), словы, якія ўжываюцца са значэннем ‘часавая мяжа якога-н. дзеяння, найменшая магчымая велічыня’ *прыход, рубеж, прыезд* (***Да прыходу*** *Веранікі самай прыгожай у класе лічылася Ліда Шашолка. Паход у начны чэрвеньскі лес ляжаў ужо* ***на рубяжы*** *той новай паласы жыцця, калі дзяцінства канчалася, а юнацтва яшчэ не надышло.* ***Па прыездзе ў*** *Дзеўкі я меціў кватараваць і сталавацца ў цёткі, стрыечнай матчынай сястры.*).

Назоўнік *час* прадстаўлены ССПЗ *за час, у час* (***За час*** *адпачынку я нават па цыркулярах засумаваў. Аднойчы, яшчэ* ***ў час*** *канікулаў, мы рашылі праверыць сваю вытрымку на голад.*).

У прыназоўнікавым ланцужку *на час пасля* адбываецца спалучэнне значэнняў простага прыназоўніка *за* ‘ўказвае на адлегласць да часавай мяжы’, назоўніка *час* ‘прамежак пэўнай адлегласці, у які што-н. адбываецца’, і прыслоўя *пасля* ‘па заканчэнні, здзяйсненні чаго-н.’ (*І хоць на зямлі была вясна, хоць так прывабна расцвітаў бэз, мы трымаліся стойка, адкладваючы сардэчныя справы* ***на час пасля*** *вайны*).

Наступная па колькасці група прыназоўнікаў, што ўжываецца са значэннем сацыяльнага статусу і стасункаў у грамадстве, напрыклад, *за сувязь, для сувязі з, ва ўладзе, на пасадзе, на грунце, у адносінах да, у гонар, на правах, у асобе, у адрас, па загаду, пад аховай*. Канструкцыі ўжываюцца пры ўказанні на службовае становішча, кваліфікацыю і г. д. (*Саўчанка тут быў ляснічым, але выйшаў на пенсію, застаўшыся* ***на пасадзе*** *бухгалтара.* ***Па загаду*** *каменданта на станцыі і каля школы спешна будаваліся дзоты. Старэйшыя браты* ***на правах*** *гасцей разважаюць з бацькам аб палітыцы і міжнародным становішчы.*).

У прозе І. Навуменкі назіраецца падрабязная дыферэнцыяцыя адносінаў, напрыклад, прадстаўлены колькасныя адносіны (***Па багацці*** *фарбаў, гукаў, пераходаў лес багацей за мора...*), мэтавыя адносіны (*Дзве танкеткі, пушчаныя, відаць,* ***у мэтах*** *разведкі, падарваліся на мінах...*), адносіны параўнання (*Кірылава няласка да навукі была дробяззю* ***ў параўнанні з*** *тым радасным, захапляючым, што прыносіў нам кожны ўрок.*), адносіны дапамогі (*Да вайны ў мястэчку была электрычнасць, а цяпер яго жыхары нібы перавандравалі ў каменны век: яны асвятляюць сваё жытло* ***пры дапамозе*** *лучыны і валоўяга тлушчу.*), адносіны проціпастаўлення (***У процівагу*** *Міколу, у юнацтве Цішка быў больш сузіральнай натурай...*), прычынныя адносіны (*Родныя бары і бярэзнікі* ***ў залежнасці ад*** *патрэбы маглі пераўтварыцца ў трапічныя зараснікі ці ў сібірскую тайгу.*), адносіны падабенства (*Грунвальд нічым асаблівым не вызначаўся: крытыя чырвонай чарапіцай дамкі, загнутыя* ***на манер*** *падковы двары з мураванымі хлявамі і стадоламі.*).

Такім чынам, новыя прыназоўнікі ў сваёй большасці з’яўляюцца адной з характэрных рыс мастацкага стылю. Найчасцей сустракаюцца прыназоўнікі са значэннем прасторавых адносінаў, часавых адносінаў. Ядром групы “часавыя адносіны” з’яўляюцца назоўнікі, якія ўказваюць на канкрэтны момант часу, адрэзак часу або незакончанае працяглае дзеянне. Усе яны матывуюцца абстрактнымі назоўнікамі, і характарызуюць рэальныя часавыя адносіны. Сярод прааналізавыных прыназоўнікаў вылучаюцца канструкцыі са значэннем сацыяльнага статусу і стасункаў ў грамадстве.

Яны, указваючы на адносіны "па вертыкалі", характарызуюць сацыяльную мабільнасць індывідаў, акрэсліваюць службовае становішча асобы.

Сярод прадстаўленых аўтараў якасна вылучаюцца творы І. Навуменкі. Яны характарызуюцца максімальнай насычанасцю ССПЗ, багатым спектрам у выражэнні адносінаў з дапамогай новых прыназоўнікаў і стварэннем аўтарскіх неалагізмаў (*на вечку, з сілуэтам, на парозе да, па прыездзе ў* і інш.).

У ліку прааналізаваных канструкцый сустракаюцца чыстыя ССПЗ, за якімі трывала замацаваўся статус прыназоўнікаў (*у якасці, у адносінах да, з прычыны* і г. д.), у слоўніках яны ўжываюцца з паметай *прыназ., у якасці прыназоўніка, у знач. прыназ.*;"сумніўныя" ССПЗ, у якіх адбываецца сумяшчэнне семантычнай і службовай функцый (*на фоне, на схіле, на манер, на вечку* і пад.); а таксама прыназоўнікавыя ланцужкі, дзе службовасць размыта, прадстаўлена некалькімі словамі, а семантыка канструкцыі грунтуецца на спалучэнні значэнняў яе складнікаў (*у прамежку паміж сцяной і грубкай, перад заходам сонца, пасля нападу фашыстаў, пад выглядам падрыхтоўкі ўрокаў* і інш.).

Такім чынам, працэс утварэння класа прыназоўнікаў няспынны, побач з невытворнымі прыназоўнікамі (даўно існуючымі), якія страцілі сувязь, матывацыю з паўназначнымі словамі, існуюць новыя, што знаходзяцца ў працэсе фарміравання і яшчэ не ўвайшлі ў клас прыназоўнікаў. Пра такія прыназоўнікі П.П. Шуба пісаў, што "канструкцыі, выконваючы тую самую сінтаксічную функцыю ў словазлучэнні, што і прыназоўнік, толькі імкнуцца стаць часцінай мовы, служаць базай, крыніцай, асновай для росту, узбагачэння і складвання гэтай часціны мовы – прыназоўніка" [7, с. 59].

**Літаратура**

1. Бондаренко В.С. Предлоги в современном русском языке. М.: Учпедгиз, 1961. 75 с.
2. Быкаў В. Выбранае. Мінск: Ураджай, 2001. 415 с.
3. Навуменка І. Збор твораў. У 6-ці т. Т.І. Аповесці і апавяданні. Мінск: Маст. літ., 1981. 559 с.
4. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. Мінск: БелЭн, 2002. 784 с.
5. Чорны К. Выбраныя творы. Мінск: Беллітфонд, 2000. 608 с.
6. Чыгрынаў І. Выбраныя творы. У 3-х т. Т. 1. Апавяданні. Мінск: Маст. літ., 1984. 366 с.
7. Шуба П.П. Граматычная характарыстыка прыназоўніка. Веснік БДУ. Серыя IV. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. Псіхалогія. Мінск: Выд-ва БДУ, 1970. № 1. С. 57–65.